Падтрымай "Вясну" на PATREON

Андрэя Гайдукова асудзілі на 10 сутак арышту

25.11.2014 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова, свабода мірных сходаў



Андрэй Гайдукоў

Суддзя Полацкага гарадскога судаУладзімір Бясецкі прызнаў былога палітвязня вінаватым у парушэнні артыкула 23.34 КаАП і за "правядзенне несанкцыянаванага пікета з раздачай улётак" прысудзіў Андрэю Гайдукову арышт на 10 сутак.

Інцыдэнт, які разбіраўся ў судзе, адбыўся ўчора, 24 лістапада, у Полацку. Міліцыя затрымала Гайдукова, які раздаваў мінакам улёткі пра палітвязняў. Разам з Андрэем Гайдуковым быў затрыманы Антон Паўлаў, які фатаграфаваў акцыю. Абодвух адвезлі ў міліцыю і прымусілі выдаліць усе здымкі. На Андрэя Гайдукова ў пастарунку склалі пратакол пра правапарушэнне. Тут жа ўручылі позву ў суд – 27 лістапада на 16.30. Аднак сёння апоўдні Андрэю Гайдукову дахаты прынеслі іншую позву: пра тое, што суд адбудзецца сёння ж, у 14.00.

"У судзе я заявіў, што мне патрэбны абаронца, і што я маю дамову з мінскім адвакатам. Але дабрацца так хутка да Полацку ў яго няма фізічнай магчымасці. Суддзя Уладзімір Бясецкі чакаць не пагадзіўся: ён сказаў, што дае мне паўгадзіны, каб я заключыў дамову з полацкім адвакатам. Давялося гэта зрабіць, і я лічу, што маё права на абарону ў судзе парушана: спачатку суд быў прызначаны на пазнейшую дату, а потым яго перанеслі і фактычна не далі магчымасці запрасіць да ўдзелу ў працэсе таго адваката, якому я давяраю", сказаў Андрэй Гайдукоў.

Напарадзе ў яго яшчэ адно разбіральніцтва -- па факце затрымання 21 лістапада. Ён быў затрыманы ў Наваполацку – таксама за распаўсюд улётак пра палітвязняў. У наваполацкай міліцыі на яго склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных.

"Пратакол я не падпісваў, копіі не маю, таму не магу сказаць, у парушэнні якога артыкула мяне вінавацяць. Я чуў, што па тэлефоне супрацоўнікі міліцыі камусьці тлумачылі, што мой выпадак будзе разбіраць адміністрацыйная камісія. Але ніякіх позваў у мяне пакуль няма – ні на пасяджэнне камісіі, ні ў суд", - распавёў Андрэй Гайдукоў.

Андрэй Гайдукоў - былы палітзняволены, 8 лістапада 2012 года супрацоўнікі КДБ затрымалі яго і завялі крымінальную справу паводле ч. 1 арт. 356 Крымінальнага кодэксу (здрада дзяржаве ў форме правядзення агентурнай дзейнасці). Справа Гайдукова разглядалася ў закрытым рэжыме, падчас суду абвінавачанье Гайдукову было пераквалiфікавана. 1 ліпеня 2013 года Віцебскі абласны суд асудзіў Гайдукова паводле крымінальнага артыкула «Спроба ўсталявання супрацоўніцтва са спецслужбамі, органамі бяспекі або органамі замежнай дзяржавы». Яго прызналі «вінаватым у спробах устанаўленьня кантактаў з супрацоўнікамі замежнай спэцслужбы без прыкмет дзяржаўнай здрады». 8 траўня 2014 году Андрэй Гайдукоў выйшаў на волю.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"









АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ

‹ ›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY